РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЛІПЕНЯ 2025 г. СУБОТА № 127 (30515)

## Аб чым гаварыў Прэзідэнт з нагоды Дня Незалежнасці на Кургане Славы

**Па традыцыі ў гэты найважнейшы дзень, у які мы адсвяткавалі і 81-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок да падножжа Кургана Славы, прыняў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве ў мемарыяльным комплексе.**

Звяртаючыся да гасцей урачыстасці, якія сабраліся каля падножжа велічнага Кургана Славы, і да ўсіх беларусаў і не толькі (выступленне кіраўніка дзяржавы ў прамым эфіры трансліравалі ўсе нашы тэлеканалы), Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння мы — мільёны беларусаў — адзначаем галоўнае дзяржаўнае свята нашай любімай Радзімы. «Сустракаем яго летняй раніцай у святым месцы, сярод палёў Міншчыны, якія спеюць, без страху гледзячы ў роднае сіняе неба», — удакладніў ён.

СТАР. 2–3



Фота БелТА.

# «ГЭТА НАША СПАДЧЫНА І НАЙВЯЛІКШЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, ЯКІЯ ТРЭБА БЕРАГЧЫ І АБАВЯЗКОВА АБАРАНЯЦЬ»




+TV ПРАГРАМА

СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ



ЯКІЯ АБ'ЕКТЫ СТАЛІ ПАДАРУНКАМІ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ КРАІНЫ? 6–7



НАВАЦЫІ РАЗЛІКУ: СКАНАВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫ QR-КОД НЕ ПАТРЭБНА 10

TikTok

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25127
9 771990 763008

# «ГЭТА НАША СПАДЧЫНА І ЯКІЯ ТРЭБА БЕРАГЧЫ

## «НІЗКІ ПАКЛОН І ВЕЧНАЯ СЛАВА ЎСІМ, ХТО ЗАГІНУЎ ЗА СВАБОДУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ РОДНАЙ БЕЛАРУСІ»

Прэзідэнт перакананы, што для большасці беларусаў гэта свята абазначае мір.

**«Вызваленне нашай сталіцы 3 ліпеня ў 1944 годдзе ў ходзе аперацыі «Баграціён» вярнула гэты мір на параненую беларускую зямлю і стала важным этапам на шляху Вялікай Айчыннай вайны да Вялікай Перамогі, — нагадаў беларускі лідар.**

«Вось ужо сапраўды па тых падзеях, мемарыялах і помніках, якія беларускі народ узвёў у даніну павагі пераможцам, можна вывучаць як мінімум гісторыю Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што менавіта тут, дзе цяпер знаходзіцца Курган Славы, на подступах да сэрца Радзімы, самкнулася кальцо «Мінскага катла» вакол стапяцідзесяцітысячнага войска фашыстаў, пасля разгрому якога ў лічаныя тыдні была вызвалена ўся Беларусь.

«Сёння па волі народа ў гэту знакавую дату Вялікай Айчыннай вайны мы святкуем Дзень Незалежнасці і аддаём даніну памяці тым, хто загінуў смерцю адважных за наша мірнае сёння, — сказаў беларускі лідар. — Мы ўспамінаем ахвяр вайны і ўшаноўваем нашых дарагіх ветэранаў вайны і працы, чые стойкасць, мужнасць і любоў да Радзімы будуць заўсёды прыкладам для нас і будучых пакаленняў. Нізкі паклон і вечная слава ўсім, хто загінуў за свабоду і незалежнасць роднай Беларусі».

*Аляксандр Лукашэнка прапанаваў ушанаваць іх памяць хвілінай маўчання.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## «ЗАДАЧА ЎСІХ ЛЮДЗЕЙ ДОБРАЙ ВОЛІ — АБ'ЯДНАЦЦА, СПЫНІЦЬ ВАР'ЯТАЎ У ІМЯ БУДУЧЫНІ ЎСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА»

Па словах кіраўніка дзяржавы, у мірнай, шчаслівай краіне, нашай Беларусі, нам цяжка сёння ўявіць, што адчувалі людзі тады ў спустошаных ворагам гарадах і вёсках, кожны дзень сутыкаючыся вочы ў вочы са смерцю.

**«Але яны не сталі на калені, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Яны змагаліся, выжылі і перамаглі. Вораг, які прыйшоў на нашу зямлю тады, напоўніцу адчуў сілу народнага гневу рэспубліказ-партызанкі. Зямля гарэла пад нагамі акупантаў».**



Падчас размоў на тэму, хто найбольш пацярпеў у Вялікай Айчыннай вайне, Прэзідэнт папрасіў мець на ўвазе адну важную дэталь. «Хоць такой праблемы быць не павінна, але тым не менш мы павінны памятаць: знішчэнне савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (вы памятаеце, трэць або чвэрць фашысты планавалі пакінуць на гэтай тэрыторыі) пачалося тут, з Беларусі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Менавіта тут пачалося знішчэнне тых, хто жыў у Савецкім Саюзе. І мы сёння прама называем гэта генацыдам беларускага народа».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на барацьбу з ворагам узнялася ўся краіна: і старыя, і малыя, чырвонаармейцы, партызаны, падпольшчыкі. «Многія пайшлі на фронт добраахвотнікамі або цэлымі сем'ямі ў лясы, не скарыўшыся ворагу, — удакладніў беларускі лідар. — Дзеля нашай свабоды ўсе яны ступілі ў неўміручасць, ахвяраваўшы сваімі жыццямі. Гэта ў іх гонар і ў славу найвялікшага подзвігу па нашым славянскім звычаі насыпаны курган — сімвал мужнасці народа, яго барацьбы за свабоду і нязгаснай памяці ўдзячных нашчадкаў».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў, што прыклад нашых герaічных продкаў паказвае: за будучыню трэба змагацца.

**«Чалавек заўсёды можа і павінен супрацьстаяць злу, якім бы моцным і выдасканаленым яно ні было, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Сёння свет знаходзіцца на крутым пераломе і ніхто не ведае, з чым мы сутыкнёмся заўтра.**

Вы бачыце, што робіцца вакол нас. Захад ізноў вырашыў усе свае даўгі і праблемы спаліць у сусветным пажары. І адначасова спаліць некалькі мільёнаў жыхароў нашай планеты».

Задача ўсіх людзей добрай волі, і ў першую чаргу моладзі, як падкрэсліў Прэзідэнт, — аб'яднацца, спыніць вар'ятаў, спыніць у імя будучыні ўсяго чалавецтва.

## «НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА СТРАЦІЦЬ ГЭТУ ПЕРАМОГУ»

«Наша свята — сімвал свабоды і незалежнасці, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Яно ўвасабляе памяць аб подзвігу народа-пераможца і вечную ўдзячнасць нашчадкаў. Мы ганарымся нашымі ветэранамі і ўсімі, хто падарыў нам магчымасць жыць і працаваць на сваёй зямлі. Яны паказалі свету прыклады небывалай доблесці, стойкасці і патрыятызму. Нам трэба чаго б гэта ні каштавала захаваць і перадаць будучым

## Даслоўна

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**

— Дзень Незалежнасці — галоўнае свята нашай краіны. Кожны раз з асаблівымі пачуццямі мы яго адзначаем, бо разумеем, як важна, асабліва ў цяперашняй сітуацыі, захаваць мір і спакой на сваёй роднай зямлі. Усё гэта — дзякуючы тым, хто адваяваў свабоду і незалежнасць 80 гадоў таму (мы сёлета адзначылі 80 гадоў Перамогі), хто аднаўляў краіну ў пасляваенны час, стварыў суверэнную незалежную краіну на развале Савецкага Саюза. Гэта нашы людзі, якія кожны раз здзяйснялі подзвігі. Сёння мы жывём у цудоўнай краіне. Мы пад вялізным уражаннем ад выступлення Прэзідэнта нашай краіны на ўрачыстым сходзе, прысвечаным гэтаму святу. Аляксандр Рыгоравіч шчыра, адкрыта казаў аб тым, што павінен кожны для сябе ўсвядоміць: будзем разам, будзем адзіныя, будзем працаваць і рабіць усё на карысць нашай краіны (ад кожнага з нас залежыць будучыня нашай Радзімы) — вядома, будзе мір і спакой. Але да ўсяго трэба быць гатовым. На жаль, свет вельмі турбулентны. Таму, слухаючы нашага Прэзідэнта, думаю, кожны з нас, хто жыве на гэтай цудоўнай зямлі, зрабіў для сябе высновы. Мы павінны быць як ніколі адзіныя, мы павінны захоўваць святую памяць аб мінулым, гісторыі нашай — суверэннай, незалежнай — краіны, зрабіць усё для таго, каб захаваць яе такой жа цудоўнай.

**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

— Нам ёсць чым ганарыцца. У сацыяльна-эканамічным плане мы трымаем курс наперад, нягледзячы на эканамічныя санкцыі і палітычны ціск, якія спрабуюць прымяніць да нашай краіны. Асноўны разгром гітлераўскай Германіі ў Вялікай Айчыннай вайне адбыўся ў ходзе аперацыі «Баграціён», з завяршэннем яе акурат на гэтых святых месцах (у раёне Кургана Славы. — **«Зв».**). Пытанне гістарычнай памяці мы заклалі ў нашы канцэптуальныя дакументы (Канстытуцыю, Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну), што сведчыць аб яго практычнай накіраванасці. Мы не проста гаворым аб гістарычнай памяці. Мы прыкладаем усе намаганні для таго, каб гісторыя з'яўлялася абаронай нашага народа ад сённяшніх выклікаў і пагроз. Наша гістарычная свядомасць — гэта даніна памяці прадзедам, дзядам, якія са зброяй у руках 80 гадоў таму зрабілі ўсё магчымае для таго, каб над Беларуссю свяціла сонца, было мірнае неба. Мы, сучаснае пакаленне, павінны зрабіць усё магчымае, каб наша краіна і далей была бяспечнай і мірнай.

**Фёдар ФЕШЧАНКА, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, удзельнік Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён»:**

— 3 году ў год згадваю тыя падзеі, калі вызвалялі беларускую сталіцу. Гляджу на Мінск і ўспамінаю, якім ён быў, калі я разам з таварышамі ў яго ўвайшоў. А якім прыгожым наш горад стаў цяпер! Хачу пажадаць сучаснай моладзі берагчы тое, што было заваявана нашым пакаленнем. Не шукайце шчасця на чужыне: яно — на зямлі, дзе вы нарадзіліся. Шчасце бачыць, як наша краіна развіваецца, як яна мяняецца. Гэтыя дасягненні трэба не толькі зберагчы, а яшчэ і прымножыць.

**Наталля ЯКУБІЦКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Вайна — гэта смутак і боль для кожнага беларуса. Гэта трагічныя падзеі і рана на целе нашага народа, якая не загойваецца. Нягледзячы на тое, што час аддзяляе нас ад тых падзей, боль не сціхае і ніколі не сціхне. Ніколі не зарастуць сцяжыны да абеліскаў, помнікаў, мемарыялаў. Мы — пакаленне ўдзячных, а таму

# НАЙВЯЛІКШЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, І АБАВЯЗКОВА АБАРАНЯЦЬ»

пакаленням веру ў пераможны дух продкаў, уласныя сілы і ў тое, што разам мы справімся з любымі выклікамі. Нам ні ў якім разе нельга страціць гэту Перамогу. Яна — годнасць нашага народа, прыкмета яго велічы. Такія факты ў гісторыі не страчваюцца».

Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што мір, свабода і незалежнасць — гэта наша спадчына і найвялікшыя каштоўнасці, якія трэба берагчы і абавязкова абараняць.

> **«Трэба ўмацоўваць народнае адзінства, эканоміку і абарону нашай Айчыны, — падкрэсліў Прэзідэнт. Кожны дзень, кожную гадзіну. У гэтым абавязак сучаснікаў перад мінулым і будучым, каб жыла і квітнела наша любімая Беларусь!**

Калі мы ўсе разам прасякнемся гэтым пачуццем (вось гэтыя дзеткі, якія ўступаюць у жыццё, больш дарослыя і мы), то захаваем нашу краіну — ціхую, спакойную, пад мірным блакітным небам. Здароўя вам, дарагія сябры, шчасця і дабрабыту. З Днём Незалежнасці! Са святам вас!»

*У завяршэнні ўрачыстасці пад залпы гармат прагучаў Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.*

## «У ПАМЯЦЬ АБ ІХ ТАКУЮ БЕЛАРУСЬ МЫ ПАВІННЫ ЗАХАВАЦЬ»

Пасля цырымоніі Прэзідэнт падышоў да ветэранаў, паразмаўляў з імі. «Дзякуй вам, у вашай асобе — тым, у імя каго ўзведзены гэты велічны манумент, — звярнуўся ён да галоўных удзельнікаў урачыстасці. — Вялізны дзякуй ад усіх нас тым, хто да гэтай хвіліны не дажыў. У памяць аб іх такую Беларусь мы павінны захаваць».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што камусьці, асабліва моладзі, нечага не хапае. «Як я жартую, то бульбы, то яшчэ нечага, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Але вы, разам з намі ў тым ліку, разумееце: гэта дробязі ў параўнанні з тым, што давялося перажыць у свой час у маладосці вам і тым, каго сёння няма. Таму гэта самае простае. Бульба ў нас будзе. Яна ўжо ёсць. Здароўя вам! Доўга жывіце! Вы — гэта не толькі памяць, вы — будучыня нашай краіны. Дзякуй вам і, яшчэ раз паўтараю, у вашай асобе — усім тым, каго сёння з намі няма. За вамі стаяць нашы героі, ваеннаслужачыя, якія зусім нядаўна адстаялі нашу краіну, спыніўшы мяцеж, якія нашу Беларусь нікому не аддадуць!»

Прэзідэнт заўважыў, што не нагнятае абсатноўку. Па яго словах, каб не «прашлёпаць сітуацыю, як гэта было ў чэрвені 1941 года», мы павінны быць гатовы да ўсяго. «Не ўгаворваць, не закалыхваць, не заяўляць, што ўсё ціха, спакойна, нічога не будзе, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Усё будзе добра, але рыхтавацца мы павінны да самага горшага. Будзе лепш — мы будзем рады. Простая народная палітыка».

Каля падножжа Кургана Славы Прэзідэнт таксама паразмаўляў з дзеючымі ваеннаслужачымі і курсантамі.

«Ваяваць мы не хочам больш, чым хто-небудзь. Але...» — пачаў Аляксандр Лукашэнка. «Любімую не аддаюць!» — працягнулі побач. «Гэта дакладна!» — пагадзіўся Прэзідэнт.

Да беларускага лідара нечакана звярнуўся курсант 3 курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Расціслаў Далгоў.

«Таварыш Прэзідэнт, я ішоў да вас доўгіх 11 гадоў: з 2014-га, як мы прыехалі сюды з Украіны», — расказаў малады чалавек.

«З Украіны прыехаў? Але мы цябе не пусцім ваяваць. Будзеш ужо Беларусь абараняць!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Расціслаў ад сябе асабіста і ад сваёй сям'я выказаў кіраўніку дзяржавы ўдзячнасць за тое, што Беларусь стала для іх не толькі домам, але і новым этапам у жыцці сям'і.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці працуюць яго бацькі, ці выхоўваюцца ў сям'і яшчэ дзеці. Як высветлілася, іх у бацькоў трое.

«Мой бацька — ваш вельмі вялікі фанат», — звяртаючыся да Прэзідэнта, сказаў курсант і папрасіў сфатаграфавацца з беларускім лідарам. Пасля памятнага фатаграфавання з курсантамі Ваеннай акадэміі кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь заўсёды адкрыта для ўкраінцаў. «Вы нашы людзі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — І ніколі не слухайце, што мы ваюем або ваяваць збіраемся. Гэта нашы людзі!»

## «З ХЛЕБАМ БУДЗЕМ. І З БУЛЬБАЙ ТАКСАМА»

Нягледзячы на святочны настрой, як заўсёды, Прэзідэнта хвалююць справы надзённыя. Па прыбыцці да мемарыяльнага комплексу ён пацікавіўся ў старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксея Кушнарэнкі, як у вобласці спраўляюцца з уборачнай. Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі, што на Міншчыне, у цэлым па краіне работы ідуць згодна з планам.

«Першы ўкос — ужо ўсё, — удакладніў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. — Віцебшчына засталася. Цёпла стала, ужо кукуруза пачала нармальна ўзнімацца».

У размове з ветэранамі кіраўнік дзяржавы адзначыў, што надвор'е сёлета будзе садзейнічаць добраму ўраджаю. «Гасподзь падарыў нам добрае надвор'е, — канстатаваў ён. — Дажджы, дажджы, але гэта на карысць. Глядзіце, ніколі такіх палёў не было. Значыць, з хлебам будзем. І з бульбай таксама».

Акрамя таго, Прэзідэнт закрануў тэму добраўпарадкавання тэрыторыі вакол мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». На яго думку, вакол кургана, які сам па сабе павінен быць без насаджэнняў, трэба высадзіць больш дрэў: «Часта еду ў аэрапорт, гляджу: вось бы парк пэўны, гай большы. Губернатар абяцае тут парк закласці добры».

Фота БелТА.



вельмі важна памяць аб гэтай жудаснай трагедыі перадаць нашаму маладому пакаленню. Больш як 80 гадоў мы жывём без вайны. За апошнія 30 гадоў наша краіна настолькі інтэнсіўна развіваецца, столькі шмат зроблена для народа! І гэта, вядома, заслуга нашых людзей і нашага глыбокапаважанага Прэзідэнта. Дзякуючы адзінству, згуртаванасці, мудрасці беларускай нацыі мы маем такую цудоўную краіну, цудоўны народ.

**Алена ПАТАПАВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў:**

— Дзень Незалежнасці для любога грамадзяніна — асаблівае свята, калі ўзнікае патрэба яшчэ раз абмеркаваць і вырашыць для сябе, што значыць для яго родная краіна, успомніць, якія этапы станаўлення яна прайшла да таго часу, пакуль стала такой, якой мы бачым яе сёння. Калі паразважаць на гэту тэму, становіцца зразумелым, за які кароткі час Беларусь стала незалежна будаваць сваю палітыку, эканоміку, грамадскі уклад. Радзіма ў душы кожнага беларуса займае значнае месца. Мы адчуваем гонар за тое, што краіна стала, дзякуючы агульнаму ўнёску, такой, якая яна ёсць. Хочацца верыць, што наша галоўная каштоўнасць — Беларусь — будзе захавана, а ў будучыні перададзена дзецям і ўнукам.

**Васіль ГАПАНОВІЧ, ветэран працы:**

— Сучасная моладзь павінна разумець, што за мірнае неба мы ўдзячныя нашым дзядам і прадзедам, якія заваявалі Перамогу ў час Вялікай Айчыннай вайны, тым, хто мірнай працай пабудаваў прыгожую дзяржаву — Рэспубліку Беларусь. Трэба гэта ўсё цаніць, берагчы і прымнажаць. Не забываць пры гэтым, што зрабілі нашы продкі для краіны. Мая маці дапамагала партызанам: разам з іншымі жанчынамі вёскі гатавала ежу, мыла бінты, вязала шкарпэткі, рамантавала адзенне. Набліжалі Перамогу і іншыя сваякі: хтосьці змагаўся ў Сталінградзе, хтосьці загінуў пад Варшавай, хтосьці вярнуўся з вайны інвалідам, але працягваў працаваць на калгаснай ніве.

**Надзея ДЗЬЯЧКОВА, загадчыца дзіцячага садка № 98 г. Магілёва:**

— Усе дзяржаўныя святы выклікаюць у мяне гонар за краіну. Сваіх продкаў, якія здабылі незалежнасць, свабоду і мірнае неба над галавой, я памятаю і сёння. Мой дзядуля, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, падпісваў пры жыцці паштоўкі з пажаданнямі чыстага і мірнага неба над галавой. Праз некаторы час прыйшло ўсведамленне, наколькі гэта насамрэч важна. Дзецям у садку, вядома, расказваем пра той страшны час, стараемся прывіваць любоў да Радзімы. Тлумачым, што любіць сваю краіну — гэта значыць паважаць продкаў, бацькоў, нашу гісторыю, традыцыі і каштоўнасці.

**Уладзімір КУЗНЯЦОЎ і Аляксей СТАЛЯРОЎ (расійскія пранкеры Ваван і Лексус):**

— Мы рады знаходзіцца ў гэтыя святыя для вашай краіны дні ў Беларусі. Не кожная дзяржава так трапятліва адносіцца да сваёй гісторыі. Наадварот, імкнуцца яе забыць або перафарматаваць, укласці новы сэнс у вядомыя факты. Усе незалежныя краіны сутыкаюцца са спробамі перапісвання гісторыі. Беларусь рэгулярна сутыкаецца яшчэ і са спробамі ўмяшання ва ўнутраныя справы. Мы гэта ведаем не па чутках: гутарылі з тымі людзьмі, якія гэта спрабавалі зрабіць. Сучасная Беларусь заўсёды ўражвае, кожны свой візіт імкнёмся даведацца нешта новае. Наведваем новы горад або месца, каб больш ведаць пра вашу гісторыю. У беларусаў — усё ёсць. Самая галоўная каштоўнасць — гэта ваш народ: шчыры, працавіты, гасцінны. Заставайцеся такімі ж.

**Вераніка КАНЮТА.**



З НАГОДЫ

# «ЧАС НАШЫХ ПЕРАМОГ — ЧАС НАШЫХ НАДЗЕЙ»

## Знакамітыя майстры, таленавітая моладзь і кранальныя кампазіцыі

Гала-канцэрт майстроў мастацтваў і таленавітай моладзі «Час нашых перамог — час новых надзей», прысвечаны Дню Незалежнасці, прайшоў у Вялікім тэатры Беларусі. Пяты год у асаблівы для ўсёй краіны дзень — 3 Ліпеня — у Вялікім тэатры прайшоў гала-канцэрт. Сёлета праграма насіла назву «Час нашых перамог — час новых надзей», а ў канцэрце былі задзейнічаны ўсе калектывы Вялікага.

Нагадаем, што ўпершыню гала-канцэрт адбыўся ў 2021 годзе і дзякуючы Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку стаў традыцыйным.

Галоўны рэжысёр і аўтар сцэнарыя гала-канцэрта Ганна Маторная адзначыла, што ў праграме былі прадстаўлены розныя кірункі — акадэмічныя, народныя, фальклорныя матывы і трагічныя лініі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сучасныя хіты.

— У першую чаргу гэта мерапрыемства прысвечана пераемнасці нашых творчых пакаленняў. На сцэне адначасова выступілі пяць пакаленняў салістаў, артыстаў балета: дзеці, маладыя выканаўцы тэатра, заслужаныя і народныя. Мы даём магчымасць творчаму маладому пакаленню з'явіцца на легендарнай сцэне разам з вопытнымі музыкамі і харэаграфічнымі калектывамі. Маладосць, шчасце, свята і вялікая любоў да сваёй краіны — вось што рухае ўсімі намі, — падкрэсліла яна.

Назва канцэрта вытрымана ў кожным нумары і дзействе ў цэлым. За гадзіну перад гледачамі паўстаў цэласны мастацкі твор, у якім кожны нумар падпарадкаваны агульнай ідэі, а гэта захаванне гістарычнай памяці, павага да мінулага, беражлівыя адносіны да таго, што нас аб'ядноўвае, і вера ў будучыню. Лагічным і прыгожым фінальным пунктам канцэрта стала выкананне песні «Прысвячэнне Беларусі» (кампазітар Аляксандр Сухараў), галоўная тэма якой — любоў да роднай зямлі і людзей, якія тут жывуць.

Як расказала перад пачаткам гала-канцэрта генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава, у канцэпцыю відовішча закладзены гісторыя, будучыня і злучэнне некалькіх пакаленняў.

— Сам змястоўны складнік даты 3 Ліпеня і вызначыў тое, што будзе адбывацца на сцэне. Унікальнае злучэнне ваеннай тэмы і жыцця Беларусі, незалежнай дзяржавы, у канцэрце прадстаўлены як адзінае цэлае. У гэтым і ёсць гістарычная праўда ў адносінах да нашай краіны. У нумарах прысутнічае ваенная тэматыка, а таксама культурная тэма, роля Вялікага тэатра ў гэтым кантэксце.

Другім складнікам канцэрта гендырэктар Вялікага адзначыла тэму будучыні, моладзі.

— Менавіта ёй мы перададзім усё тое, што бачым за акном, — прыгажосць, утульнасць, дабрабыт, спакой і мір. Гэтыя дзеці, падлеткі, маладыя людзі сёння ў полі нашага зроку. А праграма канцэрта складзеная ўнікальна — у кожным нумары відаць злучэнне некалькіх пакаленняў выканаўцаў, якія выступаюць у абсалютна роз-

# ВІНШАВАННІ АД СЯБРОЎ

Шматлікія віншаванні з Днём Незалежнасці паступілі на адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і інтэграцыйных аб'яднанняў, палітычных і грамадскіх дзеячаў, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнта Беларусі і беларускі народ павіншавалі кіраўнікі Расіі, Кітая, Казахстана, Узбекістана, Азербайджана, Таджыкістана, Кыргызстана, Туркменістана, Турцыі, Індыі, Пакістана, Ізраіля, Сербіі, Саудаўскай Аравіі, Амана, Катара, ААЭ, Егіпта, КНДР, Бахрэйна, В'етнама, Зімбабвэ, Нікарагуа, Венесуэлы, М'янмы, Сінгапура, Тайланда, ПАР, Марока, Алжыра, Шры-Ланкі, Палесціны, Судана.

Віншаванне накіраваў Патрыярх Маскоўскі і усяе Русі Кірыл.

Віншавальныя пасланні паступілі ад Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша, Генеральнага сакратара ШАС Нурлана Ермекбаева, Генеральнага дырэктара Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ФАО) Цюй Дун'юя, Генеральнага сакратара СНД Сяргея Лебедзева, Старшыні Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Бакытжана Сагінтаева, Генеральнага сакратара АДКБ Імангалі Тасмагамбетава.



**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін** у віншаванні падкрэсліў, што гэта свята, звязанае з вызваленнем Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мае вечнае значэнне і для беларусаў, і для расіян: «Змагаючыся плячо ў плячо, нашы народы ўнеслі вырашальны ўклад у Перамогу над нацызмам».

«Важна, што і сёння, перад сур'ёзнымі знешнімі пагрозамі і выклікамі сувязі брацкага сяброўства і ўзаемавыручкі, якія звязваюць нашы краіны, застаюцца такімі ж трывалымі, як і раней. Упэўнены, што, дзейнічаючы разам, мы пераадолеем любыя цяжкасці і яшчэ больш умацуем прадукцыйныя двухбаковыя сувязі — на карысць расіян і беларусаў, у інтарэсах забеспячэння стабільнасці і бяспекі на еўразійскай прасторы», — гаворыцца ў віншаванні ад расійскага лідара.



«Пад Вашым кіраўніцтвам Беларусь дасягнула сацыяльнай стабільнасці, эканамічнага развіцця і ўсебаковага прагрэсу ў розных сферах дзяржаўнага будаўніцтва, — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў **Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін.** — Будучы добрым сябрам і надзейным партнёрам, кітайскі бок шчыра рады гэтым поспехам. У мінулым месяцы мы правялі дружалюбную сустрэчу ў Пекіне. Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і гатовы сумесна з Вамі прыкладаць намаганні для таго, каб накіроўваць двухбаковыя адносіны і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва па шляху ўстойлівага і доўгатэрміновага развіцця».



**Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў** у віншаванні адзначыў: «У Казахстане высока цэняць Ваш асабісты ўклад ва ўмацаванне сувязі дружбы і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, цвёрда падтрымліваюць намаганні, накіраваныя на вывад казахска-беларускіх адносін на якасна новы ўзровень».



**Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў** асабліва падкрэсліў дасягнутыя ў апошнія гады беспрэцэдэнтна высокі ўзровень узбекска-беларускіх адносін, якія дынамічна развіваюцца па ўсіх кірунках. «Сёння пад Вашым эфектыўным кіраўніцтвам у Беларусі паспяхова рэалізуецца стратэгія маштабных пераўтварэнняў, забяспечваецца ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, павышаецца дабрабыт насельніцтва. У гэтым я яшчэ раз упэўніўся ў ходзе свайго нядаўняга знаходжання ў Мінску», — адзначана ў пасланні.



У віншаванні, якое накіраваў **Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў**, сказана: «Перакананы, што сумеснымі намаганнямі двухбаковыя сувязі і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Азербайджанам і Беларуссю будуць і ў далейшым дынамічна пашырацца і паглыбляцца па ўсіх кірунках у духу стратэгічнага партнёрства ў інтарэсах нашых дружалюбных народаў і краін».



«Таджыкістан шчыра радуецца дасягненням свайго стратэгічнага партнёра ў сацыяльна-эканамічным развіцці і ўмацаванні яго аўтарытэту на міжнароднай арэне. Шматпланавае супрацоўніцтва з дружалюбнай Беларуссю займае асаблівае месца ў знешняй палітыцы Таджыкістана», — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў **Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон.**



**Прэзідэнт Кыргызстана Садыр Жапараў** у віншавальным пасланні канстатаваў, што кыргызска-беларускае ўзаемадзеянне паступальна развіваецца па ўсім спектры двухбаковых адносін, а таксама ў рамках рэгіянальных і міжнародных арганізацый, і выказаў упэўненасць, што далейшае паглыбленне і пашырэнне супрацоўніцтва паміж краінамі будуць садзейнічаць умацаванню дружбы і росту дабрабыту народаў Кыргызстана і Беларусі.



**Прэзідэнт Туркменістана Сердар Бердымухамедаў** у сваім віншаванні выказаў упэўненасць, што дружалюбныя адносіны паміж нашымі краінамі будуць і ў далейшым умацоўвацца на карысць народаў.



Віншаванне кіраўніку беларускай дзяржавы накіраваў **Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган.** «Я перакананы, што каштоўнасць шматбаковага і рэзультатыўнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі яшчэ больш павялічыцца ў гэты перыяд, калі рэгіянальныя і глабальныя падзеі набіраюць хуткасць. Я ад усёй душы жадаю, каб заснаваныя на ўзаемнай павазе і шчырым дыялогу турэцка-беларускія адносіны выйшлі на яшчэ больш высокі ўзровень».



Ад імя ўрада, народа Індыі і ад сябе асабіста **Прэзідэнт гэтай краіны Драўпадзі Мурму** перадала цёплыя віншаванні і пажаданні Прэзідэнту і народу Беларусі: «Індыю і Беларусь звязваюць цёплыя і блізкія сувязі, адзначаныя ўзаемнай павагай, даверам і агульным імкненнем да паглыблення нашых шматпланавых адносін».



Кіраўніка дзяржавы павіншаваў **Прэзідэнт ААЭ шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян:** «Жадаю Вашаму правасхадзіцельству моцнага здароўя і шчасця, а ўраду і народу дружалюбнай Рэспублікі Беларусь — далейшага прагрэсу і працвітання».

Віншаванні таксама паступілі ад **Віцэ-прэзідэнта і Прэм'ер-міністра ААЭ, Правіцеля Дубая шэйха Мухамеда бен Рашыда аль-Мактума і Віцэ-прэзідэнта, намесніка Прэм'ер-міністра, Міністра па справах Прэзідэнта шэйха Мансура бен Заіда аль-Нахаяна.**

**Прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф** у віншавальным пасланні падкрэсліў, што дзве краіны маюць гістарычна шчырыя і сяброўскія адносіны. «Прыемна бачыць, што дзякуючы прыхільнасці Вашага правасхадзіцельства наша сяброўства трансфармуецца ва ўзаемавыгаднае эканамічнае партнёрства. З нецярпеннем чакаю цеснага супрацоўніцтва з Вамі ў наступныя дні для далейшага ўмацавання нашага шматбаковага ўзаемадзеяння».



Прывітанне таксама паступіла ад **Прэзідэнта Пакістана Асіфа Алі Зардары.** Ён падкрэсліў, што Пакістан высока цэніць дружалюбныя і канструктыўныя адносіны паміж дзвюма краінамі, заснаваныя на ўзаемнай павазе і агульных імкненнях да прагрэсу.



**Прэзідэнт Ізраіля Іцхак Герцаг** у віншавальным пасланні адзначыў: «У дзень, калі ваша краіна святкуе сваю незалежнасць, мы хочам нагадаць, як мы шануем сувязі, што аб'ядноўваюць нашы народы. У святле шматлікіх глабальных праблем, з якімі сутыкаецца чалавецтва, я спадзяюся, што ў бліжэйшыя гады Беларусь разам з усімі краінамі і народамі свету будзе квітнець і мець поспех у міры і бяспецы».



У пасланні, якое паступіла ад **Караля Саудаўскай Аравіі Сальмана бен Абдэль Азіза аль-Сауда**, адзначаецца: «Жадаю ўраду і дружалюбнаму народу Рэспублікі Беларусь далейшага прагрэсу і росквіту». Віншаванне таксама паступіла ад **Наследнага прынца, Прэм'ер-міністра Мухамеда бен Сальмана бен Абдэль Азіза аль-Сауда.**



**Султан Амана Хайсам бен Тарэк Аль Саід** перадаў Аляксандру Лукашэнку шчырыя віншаванні з нагоды Дня Незалежнасці: «Карыстаемся гэтай магчымасцю, каб пажадаць Вам шчасця і добрага здароўя, а дружалюбнаму народу Беларусі — далейшага прагрэсу і працвітання».



У віншаванні, якое накіраваў **Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах аль-Сісі,** гаворыцца: «Егіпет і Беларусь звязваюць моцныя двухбаковыя адносіны, заснаваныя на даўнім сяброўстве і агульных інтарэсах. Я з нецярпеннем чакаю далейшага пашырэння і паглыблення нашага супрацоўніцтва ў розных сферах».



Цёплыя віншаванні з нагоды Дня Незалежнасці накіраваў **Прэзідэнт Зімбабвэ Эмерсан Мнангагва:** «Далучаючыся да Вас у святкаванні гэтага гістарычнага дня, я шчыра спадзяюся, што нашы краіны прадоўжаць сумесную работу па далейшым пашырэнні, паглыбленні і ўмацаванні нашых двухбаковых адносін на ўзаемную карысць нашых народаў».



У віншаванні, якое паступіла ад **Старшыні дзяржаўных спраў КНДР Кім Чэн Ына,** выказана ўпэўненасць у тым, што традыцыйныя адносіны сяброўства і супрацоўніцтва паміж Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь будуць умацоўвацца і развівацца ў адпаведнасці з імкненнямі і спадзяваннямі народаў дзвюх краін.



**Прэзідэнт Сербіі Аляксандр Вучыч** у сваім віншаванні адзначыў: «Сяброўскія адносіны нашых краін з'яўляюцца трывалай асновай умацавання

ных жанрах. Яны са сцэны раскрываюць наша сапраўднае багацце — тое, чым мы можам ганарыцца цяпер. Нават самыя маленькія, стоячы побач і трымаючыся за руку народных і заслужаных артыстаў, я ўпэўнена, адчуваюць неверагодныя эмоцыі. А бацькі і настаўнікі ганарацца тым, што іх дзеці і выхаванцы — на галоўнай тэатральнай пляцоўцы краіны, — дадала Кацярына Дулава.

**Міністр культуры Руслан ЧАРНЕЦКІ** адзначыў, што канцэрт падымае важныя пытанні аб перадачы будучым пакаленням гістарычнай праўды праз мастацтва.

— 81 год таму нашы дзяды вызвалілі сталіцу Беларусі, і дадзеная тэма легла ў аснову канцэрта. Мы гэтага не бачылі на свае вочы, а нашы дзеці — тым больш, таму мы абавязаны цікавіца гэтым подзвігам і распавядаць пра яго дзецям. Падымаецца таксама тэма пераемнасці пакаленняў, бо калі мы не раскажам ім гістарычную праўду, то гэта зробіць нехта іншы. І не факт, што шчыра, — упэўнены ён.

**Паводле БелТА.**

СВЯТОЧНАЕ

# СІМВАЛ ЕДНАСЦІ І ЗГУРТАВАНАСЦІ

## Акцыя «Спяём гімн разам» стала кульмінацыяй Дня Незалежнасці

Маштабная патрыятычная акцыя і феерверкі сталі яркім завяршэннем святкавання Дня Незалежнасці па ўсёй краіне.



Фота БелТА.

Так, у Мінску каля стэлы «Мінск — горад-герой» тысячы гараджан і гасцей сталіцы аб'ядналіся ў выкананні Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Да ўсенароднага флэшмобу далучыліся ўдзельнікі гала-канцэрта «Моцныя ў адзінстве, адзіныя ў песні», артысты, валанцёры, гледачы і моладзь.

Момант выканання гімна стаў асабліва кранальным і значным — над плошчай раздаецца адзіны голас, сцягі падымаюцца ў неба, на тварах людзей — эмоцыі гонару і згуртаванасці. Адразу пасля выканання гімна неба над сталіцай асвяціў відовішчны феерверк. Яркія залпы падымаліся над горадам пад гукі святочнай музыкі, завяршаючы насычаную праграму галоўнага дзяржаўнага свята краіны.

Таксама і ва ўсіх абласных цэнтрах акцыя «Спяём гімн разам» стала апагеем святочных мерапрыемстваў, якія праходзілі на канцэртных пляцоўках і ў знакавых месцах гарадоў.

# З УСЯГО СВЕТУ

ўсебаковага сербска-беларускага супрацоўніцтва, і я ўпэўнены, што мы пасадзейнічаем гэтаму сумеснай работай на карысць грамадзян Рэспублікі Сербіі і Рэспублікі Беларусь».



**Прэзідэнт В'етнама Льюнг Кыонг** адзначыў: «Я цвёрда перакананы, што пасля надзвычай паспяховага візіту ў Беларусь Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Лама ў маі гэтага года і ўстанаўлення стратэгічнага партнёрства паміж В'етнамам і Беларуссю традыцыйнае сяброўства і шматграннае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі атрымаюць магутнае развіццё і выйдуць на новы ўзровень у імя агульных інтарэсаў двух народаў, міру, стабільнасці і развіцця ў рэгіёне і ва ўсім свеце».



У віншаванні на адрас Прэзідэнта Беларусі **Прэзідэнт Нікарагуа Даніэль Артэга Саавэдра і віцэ-прэзідэнт Расарыё Мурыльё** пацвердзілі непахісную рашучасць працягваць умацоўваць сувязі братэрства, салідарнасці і супрацоўніцтва, якія гістарычна склаліся і якія аб'ядноўваюць народы Беларусі і Нікарагуа ў агульнай барацьбе за больш справядлівы, шматпалярны і па-сапраўднаму гуманны свет.



**Старшыня Дзяржаўнага адміністрацыйнага савета, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Саюз М'янма Мін Аун Хлайн** адзначыў: «Упэўнены, што мой візіт у Беларусь у сакавіку 2025 года і змястоўныя перагаворы заклалі трывалую аснову для далейшага ўмацавання нашага супрацоўніцтва».



**Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура** падкрэсліў: «Гэта дата — цудоўная магчымасць пацвердзіць гатоўнасць Венесуэлы паглыбляць сувязі братэрства і стратэгічнага супрацоўніцтва з Беларуссю ў імя пабудовы агульнай мірнай будучыні, развіцця і сумеснага працвітання».



**Прэзідэнт Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Сірыл Рамафоса** перадаў Аляксандру Лукашэнку цёплыя прывітанні і найлепшыя пажаданні і пацвердзіў імкненне да далейшага ўзмацнення і ўмацавання выдатных сувязяў сяброўства, якія існуюць паміж нашымі краінамі.



**Кароль Марока Мухамед VI** у сваім віншаванні даў высокую ацэнку двухбаковым адносінам, заснаваным на цесным сяброўстве і ўзаемнай павазе. «Таму я з нецярпеннем чакаю прадаўжэння работы з Вашым правасхадзіцельствам для ўмацавання нашых сувязяў і пашырэння супрацоўніцтва на карысць нашых народаў», — гаворыцца ў віншаванні.



**Прэзідэнт Рэспублікі Сінгапур Тарман Шанмугаратнам** у віншавальным пасланні адзначыў: «З нагоды святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь ад імя народа Сінгапура хачу выказаць нашы самыя цёплыя віншаванні і шчырыя пажаданні далейшага міру, прагрэсу і працвітання вашай краіне і народу».



**Кароль Тайланда Маха Вачыралонгкорн** у віншаванні Аляксандру Лукашэнку адзначыў: «Вузы сяброўства паміж Тайландам і Рэспублікай Беларусь, асабліва ў сферы гандлю і эканомікі, істотна ўмацаваліся. Перакананы, што з улікам мэт і пры падтрымцы Вашага правасхадзіцельства мы будзем працягваць разам працаваць для прасоўвання і ўмацавання нашага ўзаемадзеяння».



У сваім віншаванні **Прэзідэнт Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка Анура Кумара Дысанаяке** адзначыў, што адносіны паміж дзвюма краінамі будуюцца на падставе цеснага сяброўства, узаемапавагі і шырокага супрацоўніцтва ў многіх сферах, і выказаў спадзяванні на працяг цеснага супрацоўніцтва.



**Кароль Бахрэйна Хамад бен Іса аль-Халіфа** накіраваў віншаванні і найлепшыя пажаданні ад імя народа і ўрада каралеўства: «Вашаму правасхадзіцельству нашы шчырыя пажаданні моцнага здароўя і шчасця асабіста для Вас, а Вашаму народу — бесперапыннага прагрэсу і працвітання».



**Прэзідэнт Дзяржавы Палесціна Махмуд Абас** у віншаванні адзначыў: «Мы карыстаемся магчымасцю, каб выказаць нашу зацікаўленасць ва ўмацаванні двухбаковых адносін, а таксама падзяку за пазіцыю Рэспублікі Беларусь пад Вашым мудрым кіраўніцтвам у падтрымцы нашага народа і яго справядлівай справы на міжнароднай арэне», — гаворыцца ў віншаванні.



«Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы выказаць задавальненне ўзроўнем нашых двухбаковых адносін. Упэўнены, што Ваш візіт у Алжыр, які мае адбыцца, зробіць эфектыўны і адчувальны ўнёсак у развіццё гэтых адносін у агульных інтарэсах нашых дружалюбных краін», — гаворыцца ў віншаванні, якое паступіла ад **Прэзідэнта Алжыра Абдэльмаджыда Тэбуна.**



**Прэзідэнт Рэспублікі Чад Махамат Ідрыс Дэбі Ітна** выказаў глыбокае задавальненне добрымі адносінамі дружбы і супрацоўніцтва, якія склаліся паміж дзвюма краінамі, а таксама выказаў пажаданне, каб гэтыя адносіны пашыраліся і ўмацоўваліся.



**Старшыня Пераходнага Суверэннага савета Судана Абдэль Фаттах аль-Бурхан Абдэль Рахман** у віншаванні запэўніў у «цвёрдым імкненні ўмацоўваць сувязі братэрства і выдатныя адносіны супрацоўніцтва, якія існуюць паміж нашымі дзвюма краінамі, на карысць нашых народаў».

**Старшыня Веча народаў Рэспублікі Сербскай Босніі і Герцагавіны Срэбранка Голіч** у віншаванні падкрэсліла, што падчас свайго візіту ў Мінск у сакавіку гэтага года пераканалася, як шмат значыць для народа Беларусі свабода і як у краіне шануюць загінулых за свабоду і незалежнасць. Яна таксама выказала надзею на далейшае ўмацаванне дружалюбных і брацкіх двухбаковых адносін і заявіла аб гатоўнасці сумесна пераадольваць выклікі, што ўзнікаюць.

**Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш** павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з Днём Незалежнасці. Ён таксама адзначыў, што нацыянальныя святы — гэта не толькі падстава для ўрачыстасцяў, але і магчымасць задумацца аб глабальных выкліках, з якімі сутыкаецца ўсё чалавецтва.

**Генеральны сакратар ШАС Нурлан Ермекбаеў** выказаў шчырыя віншаванні з нагоды дзяржаўнага свята: «Шчыра жадаем, каб Рэспубліка Беларусь працягнула свой шлях развіцця ў якасці паспяховай дэмакратычнай дзяржавы. Удзячныя за актыўны ўнёсак Мінска ў работу і ўдасканаленне дзейнасці Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва».


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 60 %

| | |
|---|---|
| **Организатор** | ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1 |
| **Продавец** | ОАО «Труд», г. Гомель, ул. Советская, д. 39 |

**Аукцион состоится 21.07.2025 в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.
**Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 07.07.2025 по 17.07.2025 до 16.00** по указанному адресу.
**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**Предмет аукциона:**

**ЛОТ № 1. Два изолированных помещения** (складское помещение с инв. № 350/D-246855, пл. **962,4 кв. м,** производственное помещение с инв. № 350/D-246852, пл. **330,5 кв. м, два капитальных строения (склад (ангар)** с инв. № 350/С-181548, пл. **521,0 кв. м,** здание административно-хозяйственное с инв. № 350/С-161164, пл. **26,0 кв. м, тепловая сеть** протяженность – **213,6 м, водопроводная сеть** протяженность – **89,4 м, канализационная сеть** протяженность – **149,2 м).**

**В состав лота входят:** ворота металлические (инв. № 12) 8,60 м, дорога асфальтированная (инв. № 029) 101 кв. м, забор деревянный с воротами (запасной вход) (инв. № 08) 157 кв. м, забор с воротами (инв. № 026), 132 м, навес (инв. № 09), яблоня /30 (инв. № 9026), яблоня /35 (инв. № 9022), яблоня /35 (инв. № 9023), яблоня /38 (инв. № 9024), яблоня /41 (инв. № 9020), яблоня /44 (инв. № 9021), яблоня /44 (инв. № 9025).

Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/1/2.

**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006000452** общей площадью **1,3847 га.**

**Право постоянного пользования (доля в праве 1/1).**

**Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации производственных зданий.

Подробный перечень изолированных помещений, капитальных строений, входящих в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона **https://ocenkaservis.by (раздел «Очные торги»).**

**Начальная цена с учетом НДС 20 %: 367 500,00 бел. руб.**

Задаток **5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с **Продавца (ОАО «Труд»):** р/с BY11BLBB30120400062954001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400062954, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | В рабочие дни по предварительному согласованию **8 (044) 551-22-67** Пастарнаков Никита |

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить **вознаграждение организатору в размере 4 % от цены продажи лота** в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи, в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента его подписания.**

Проводится аукцион в соответствии с Положением закрытого акционерного общества «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.04.2025 г.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайтах: **Организатора торгов – https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Луговая, д. 12** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 4 х 10 м.

Площадь: 31,5 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1960 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Гурбо Мария Ивановна.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 5 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **открытого акционерного общества «Весейский Покров»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион

**по продаже административного здания**
**с инв. № 640/С-87804 общей площадью 508,1 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,2036 га**
***(право аренды по 13.06.2033)***
**с кадастровым номером 624687201401000050 по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Калита, ул. Центральная, 4.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **19 139,96** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 913,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2025.*

Аукцион состоится **22.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.07.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: (801795) 4-82-57, 8 (029) 340-15-01.**

УНН 600043258



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 80 %**

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**
**Продавец: КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.**

**Торги состоятся 17 июля 2025 года в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.

Подробный перечень имущества – лоты №№ 1–5, 7, 13, 14, 16–19, 21–25, 27, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – **gomel-region.by** в разделе «Экономика / Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества», на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by** в разделе «Аукционы – Очные торги».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 22.03.2025 г., от 05.04.2025 г., в газете «Звязда» от 22.03.2025 г.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 07.07.2025 по 15.07.2025 с 9.00 до 16.00.**

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (033) 634-86-95 **Насонов Николай Владимирович (запись на осмотр имущества);** 8 (029) 835-67-42 **Насонов Владимир Валерьевич.**

**Контактные данные организатора аукциона:**
(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19.
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 491382947



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Луговая, д. 23** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта)**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5 х 10 м.
Площадь: 45,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1964 года постройки.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Хохол Сергей Викторович, Хохол Валентина Викторовна.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 5 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462


З НАГОДЫ

# ПАДАРУНКІ ДА СВЯТА

## Традыцыйна ў нашай краіне да дзяржаўных дат прымеркавана адкрыццё новых аб'ектаў

Сёлета ў першыя дні ліпеня ў Беларусі з'явіліся дадатковыя магчымасці для ўмацавання здароўя, дыягностыкі і лячэння, а таксама для добрага настрою і проста шчаслівых хвілін разам з блізкімі.



### З КЛОПАТАМ АБ ЗДАРОЎІ

Шэраг новых медыцынскіх аб'ектаў адкрыўся напярэдадні Дня Незалежнасці ў розных рэгіёнах нашай краіны.

**У сталіцы пасля рэканструкцыі расчыніла дзверы гарадская паліклініка № 13. Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА** уручыла паліклініцы сертыфікат на механатэрапеўтычны рэабілітацыйны апарат. Спікер назвала падзею знакавай для жыхароў Савецкага раёна сталіцы. «Здароўе нашых грамадзян — гэта прыярытэт сацыяльнай палітыкі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

**Чатыры палаты павышанай камфортнасці для ветэранаў вайны і працы сталі падарункам Мінскай цэнтральнай раённай клінічнай бальніцы ад Беларускага фонду міру.** Дзве — у Бараўлянах і дзве — у філіяле, размешчаным у Атоліне. У памяшканнях выкананы касметычны рамонт і ўстаноўлена новае абсталяванне, бытавая тэхніка. Акрамя гэтага, Беларускі фонд міру набыў для Мінскай ЦРКБ апарат ШВЛ з пашыраным функцыяналам.

Акцыю па стварэнні камфортных умоў знаходжання ў стацыянарах ветэранаў вайны і працы рэалізоўваецца фондам на працягу некалькіх гадоў. У Мінскай вобласці ўжо адкрыта больш як 60 падобных палат. Сёлета такі падарунак атрымалі Барысаўская, Вілейская і Клецкая ЦРБ.



Паліклініка № 13 г. Мінска.

**У Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы запрацаваў новы ангіяграфічны комплекс.** Абсталяванне набыло Міністэрства аховы здароўя. Брэсцкая аблбальніца атрымала апарат высокага класа замежнай вытворчасці. Кошт ангіёграфа з улікам апарата электрафізіялагічнага даследавання складае амаль 3,2 мільёна рублёў. Дзякуючы яму брэсцкія медыкі змогуць выконваць не толькі дыягнастычныя, але і лячэбныя маніпуляцыі. Абласны бюджэт на суму 2,6 мільёна рублёў прафінансаваў рэканструкцыю аперацыйнай і дапаможных памяшканняў.

Гэты ангіяграфічны комплекс дазваляе праводзіць даследаванні любых сасудаў, у тым ліку перыферычных. Асноўная яго накіраванасць — на дыягностыку і лячэнне сэрца. У Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы пераважна будуць выкарыстоўваць апарат для хірургічнага лячэння арытміі сэрца.

**Некалькі новых медыцынскіх аб'ектаў прадставіла сваім жыхарам Віцебская вобласць.** Уведзены ў эксплуатацыю рэнтген-кабінет у філіяле № 6 Віцебскай гарадской цэнтральнай паліклінікі. Сучасны лічбавы рэнтгенадыягнастычны комплекс «Уніэксперт 3 плюс» на тры рабочыя месцы дасць магчымасць даследаваць пацыентаў з паталогіяй сістэм органаў дыхання, сардэчна-сасудзістай, мочавыдзяляльнай, а таксама страўнікава-кішачнага тракта.

Для камфорту медыкаў праведзены рамонт восьмага і дзявятага паверхаў у інтэрнаце для работнікаў Віцебскай абласной клінічнай бальніцы.

Адкрыўся кабінет мамаграфіі ў Браслаўскай ЦРБ. Пасля рамонту расчыніла дзверы перад пацыентамі аддзяленне сястрынскага догляду ў Расонскай цэнтральнай раённай бальніцы. Памяшканне не толькі адрамантавана, але і аснашчана новай мэбляй, шматфункцыянальнымі ложкамі, бактэрыцыднымі рэцыркулятарамі паветра.

**У Гродне ў мікрараёне Фолюш уведзена ў эксплуатацыю дзіцячая амбулаторыя.**

У абласным цэнтры працягваецца будаўніцтва абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера, а таксама новага корпуса кардыялагічнага цэнтра, новай гарадской клінічнай бальніцы.

### УЛАСНЫ ДОМ ДЛЯ АКТЫЎНАЙ МОЛАДЗІ

**Напярэдадні свята ў Мінску адкрыўся Дом моладзі.** Новая маладзёжная прастора размясцілася па вуліцы Талбухіна, 18. У будынку маюцца вялікая зала на 584 месцы, святлодыёдны экран з 400 LED-блокаў, гукавая сістэма і звыш 100 светлавых прыбораў. У Доме моладзі размесцяцца гарадскія структуры грамадскіх аб'яднанняў «БРПА» і «БРСМ». Тут будуць ладзіцца сустрэчы, прэзентацыі,



Дом моладзі ў Мінску.

адукацыйныя і патрыятычныя мерапрыемствы. Будынак абсталяваны інтэрактыўнымі лесвіцамі: канструкцыя дазваляе дэманстраваць медыяфайлы і выкарыстоўваць прастору для стварэння кантэнту ў сацсетках.

Унутры Дома моладзі таксама добраўпарадкаваны перагаворныя зоны, каворкінгі і выставачныя пляцоўкі. Тут будуць праходзіць рэпетыцыі, прэзентацыі і конкурсы «Студэнт года», «Каралева студэнцтва», а таксама работа па праекце «100 ідэй для Беларусі». Установа адкрыта для ўсіх і працуе штодня ў гнуткім рэжыме, часам да позняй ночы.

### ДЛЯ СПОРТУ І АКТЫЎНАГА АДПАЧЫНКУ

У дні ўрачыстасцяў стала болей спартыўных аб'ектаў і гульнявых пляцовак.

**У Гродзенскай вобласці ўвялі ў эксплуатацыю шматфункцыянальны спартыўны комплекс санаторыя «Жамчужына» УП «АзотСэрвіс».** Сучасны аб'ект вырас на месцы старых складоў. Новы спартыўны комплекс мае зоны для камандных і індывідуальных заняткаў, а таксама для трэніровак прафесійных каманд. Прасторныя залы, мадэрнізаваныя пакрыцці і камфортныя раздзявальні ствараюць бяспечнае і зручнае асяроддзе для людзей усіх узростаў і ўзроўняў падрыхтоўкі.

У комплексе можна гуляць у валейбол, баскетбол, вялікі тэніс, міні-футбол і індор-хакей. Тут будуць займацца не толькі адпачывальнікі санаторыя, але і супрацоўнікі ААТ «Гродна Азот», а таксама жыхары і госці абласнога цэнтра.

**У гарадскім пасёлку Капаткевічы Петрыкаўскага раёна Гомельшчыны адкрылі стадыён.** Яго рэканструкцыю пачалі ў 2024 годзе. Цяпер тут размешчаны валейбольная, баскетбольная пляцоўкі, футбольнае поле, воркаўт-пляцоўка. На стадыёне будзе ўдасканальваць сваё майстэрства каманда ДЮСШ Петрыкаўскага раёна, а для вучняў Капаткевіцкай сярэдняй школы тут зладзяць урокі фізічнай культуры і здароўя.

**Новы стадыён «Каралін» пры раённай ДЮСШ з'явіўся ў Ельску.** Яго будаўніцтва пачалося ў 2023 годзе. У Ельскай ДЮСШ аддаюць перавагу пяці відам спорту: футболу, самба, дзюдо, настольнаму тэнісу, лёгкай атлетыцы.

**Для жыхароў Светлагорска падарункам да свята стала лыжаролерная траса**, якая ўяўляе сабой лініі дыстанцый на 750 і 500 метраў. Асфальтабетоннае пакрыццё забяспечвае добрыя ўмовы для заняткаў спортам як аматараў, так і прафесіяналаў. Новы аб'ект прымыкае да Лядовай арэны і ДЮСШ-2, ствараючы цэлы спартыўны комплекс.

**Сучасную шматфункцыянальную спартыўную пляцоўку падарылі да Дня горада і Дня Незалежнасці бабруйчанам**. Дзіцячы спартыўна-гульнявы комплекс на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 66 з'явіўся дзякуючы рэспубліканскаму сацыяльнаму праекту Прэзідэнцкага спартыўнага клуба па падтрымцы спорту і здаровага ладу жыцця «Спорт для ўсіх» і пры ўдзеле Бабруйскага гарвыканкама і гарсавета. У распараджэнні юных гараджан цяпер гульнявое абсталяванне, пляцоўкі для воркаўта і фізічных трэніровак, баскетбола, футбольнае міні-поле і зручная тэрыторыя для тых, хто мае абмежаваныя магчымасці.

**У Магілёве з'явіўся... Хабараўскі дворык**. Падобных зон адпачынку ў абласным цэнтры ўжо 17, дызайн гэтага зроблены хабараўскімі архітэктарамі на конкурснай аснове. Праект рэалізаваны ў рамках дагавора аб пабрацімстве паміж Магілёвам і расійскім Хабараўскам. Атмасферу Далёкага Усходу на вуліцы Піянерскай ствараюць амфітэатр, сцэна, арэлі, альтанкі і дзіцячая пляцоўка.



Хабараўскі дворык у Магілёве.

## ДАНІНА ПАВАГІ І ПАДЗЯКА

**У Баранавічах адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця манумента ў гонар прысваення ганаровага звання «Горад працоўнай славы 1941—1945 гадоў».** Рашэнне аб прысваенні звання было прынята Саветам кіраўнікоў дзяржаў СНД як даніна павагі і падзяка жыхарам горада за значны ўнёсак у дасягненне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Манумент устанавілі на вуліцы Савецкай. Дамінантай кампазіцыі з'яўляецца стэла вышынёй больш за 10 метраў. Яна размешчана ў цэнтры пяціканцовай зоркі з цёмна-чырвонай гранітнай пліткі. Аснову стэлы апраўляе металічнае кальца, на якім адлюстраваны сюжэты ваеннага часу, герб Баранавічаў.

**У вайсковай часці 5524, якая дыслацыруецца ў Віцебску, да Дня Незалежнасці ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылі Алею памяці герояў.** Створаная пры падтрымцы БСЖ і абласнога аб'яднання прафсаюза, алея прызначана для правядзення патрыятычных мерапрыемстваў вайскоўцаў і выхаванцаў ваенна-патрыятычнага клуба. На ёй размешчаны стэнды з іменамі і ўказаннем подзвігаў Герояў Савецкага Саюза, военачальнікаў, якія зрабілі значны ўнёсак у Вялікую Перамогу і вызваленне Віцебскай вобласці.

**У Гродне на тэрыторыі 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады прэзентаваны мемарыяльны комплекс «Стэла Перамогі».** Ён прысвечаны героям Вялікай Айчыннай вайны.

**У святочныя дні Бабруйск упрыгожыў мурал, прысвечаны двойчы Герою Савецкага Саюза Паўлу Батаву.** Арт-аб'ект пад назвай «Спадчына і будучыня» нанесены на фасадзе жылога дома № 57 на бульвары Прыбярозінскі. Павел Батаў — генерал арміі, якая вызваляла Бабруйск у чэрвені 1944 года ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## УКЛАД У ЭКАНОМІКУ

**У Баранавічах увялі ў эксплуатацыю першы корпус індустрыяльнага парка.** У найбліжэйшы час тут пачнецца выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі: тэхнічных вентылятараў, тэлекамунікацыйных вырабаў і сілавога абсталявання. Індустрыяльны парк заклікаiы стаць адным з імпульсаў да развіцця горада.

**У Ваўкавыскім раёне гэтымі днямі ўрачыста адкрылі малочнатаварны комплекс і мост цераз раку Рось. У Воранаўскім — новую дыягнастычную станцыю.**

**Паводле паведамленняў нашых карэспандэнтаў. Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і БелТА.**

НА КАНТРОЛІ

# ТРЭБА ПАСКОРЫЦЦА

## Ігар Сергяенка ацаніў ход нарыхтоўкі травяных кармоў у Шаркаўшчынскім і Мёрскім раёнах

Старшыня Палаты прадстаўнікоў, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці Ігар Сергяенка 4 ліпеня ў рамках рабочай паездкі ў Віцебскую вобласць наведаў сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Шаркаўшчынскага і Мёрскага раёнаў з мэтай ацэнкі ходу нарыхтоўкі кармоў для буйной рагатай жывёлы.

*ДАВЕДКА. У Віцебскай вобласці на раніцу 4 ліпеня скошана траў першым укосам 73,4 % ад плана (у мінулым годзе — 100 %), нарыхтавана травяных кармоў на адну ўмоўную галаву жывёлы — 7,61 цэнтнера кармавых адзінак.*

*У Шаркаўшчынскім раёне пакзчык нарыхтоўкі траў першага ўкосу на 4 ліпеня склаў 74,1 %, або 5,44 цэнтнера кармавых адзінак на адну ўмоўную галаву жывёлы. У 2024 годзе гэты паказчык складаў 8,15 цэнтнера кармавых адзінак.*

Кіраўнік дэпутацкага корпуса пабываў у КУП(СХ)П імя Маркава і ААТ «Жвіранка», якія размешчаны ў гэтым раёне, і заслухаў даклады кіраўнікоў прадпрыемстваў аб тым, як ідзе працэс нарыхтоўкі кармоў.

— З надыходам спрыяльных умоў надвор'я намецілася актыўнасць у палях: работа арганізавана, прымаюцца меры кіраўніцтвам раёна па накіраванню механізаваных атрадаў у палі. Трава вырасла — будзем з кармамі. Але ў параўнанні з мінулым годам нарыхтавана менш, — адзначыў Ігар Сергяенка.

У Мёрскім раёне кіраўнік дэпутацкага корпуса наведаў ААТ «Любінава», УП «Чарэсы» і ААТ «Туркова». У раёне адзначаецца адзін з самых нізкіх паказчыкаў у вобласці па тэмпах нарыхтоўкі кармоў — скошана 53,5 %. На адну ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавана 5,18 цэнтнера кармавых адзінак (у 2024 годзе — 7,2 цэнтнера).

Пры гэтым у сувязі з паляпшэннем умоў надвор'я назіраецца станоўчая тэндэнцыя.

— Ва ўсіх гаспадарках арганізавана работа па нарыхтоўцы кармоў, у тым ліку з задзейнічаннем тэхнікі механізаванага атрада з Верхнядзвінскага раёна. Закладка сенажу ў траншэі і нарыхтоўка сена ажыццяўляецца з захаваннем тэхналогій. Арганізаваны падвоз гарачага харчавання механізатарам, — адзначыў Ігар Сергяенка пасля наведвання сельгасарганізацый.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу (Гродненский филиал)**

**Аукцион состоится 23.07.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | Лот № 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43.<br>Условия проведения аукциона:<br>- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;<br>- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя;<br>- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 428 028,96 руб. (четыреста двадцать восемь тысяч двадцать восемь рублей девяносто шесть копеек) с учетом НДС 20 % |
| **Сумма задатка** | 42 802 руб. (сорок две тысячи восемьсот два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 21.07.2025 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Гореничи, ул. Солнечная, д. 19** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6 х 12 м.

Площадь: 25,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1918 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный жилой дом находится в аварийном состоянии.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: наследник – Тюхай Андрей Алексеевич, умер 03.11.2023 г.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 1 года.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462



## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Гореничи, ул. Солнечная, д. 19**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Гореничи, ул. Солнечная, д. 19 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Наследник – Тюхай Андрей Алексеевич, умер 03.11.2023 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням). Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидская обувная фабрика»**

**Аукцион состоится 24.07.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 420/С-34179 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных, меховых и (или) кожаных изделий, наименование – здание корпуса цеха № 10), с составными частями и принадлежностями. ЛОТ № 1 расположен на земельном участке площадью 0,1819 га с кадастровым номером 423650100007000809, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. 8 Марта, 24В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 В; охранная зона систем газоснабжения. Часть земельного участка. Ограничения согласно положению «О порядке установления охранных зон объектов газораспределительной системы, размерах и режиме их использования», утвержденному постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 06.11.2007 № 1474, площадь 0,0851 га |
| **Условия аукциона** | - возмещение победителем аукциона затрат, понесенных продавцом в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» на проведение независимой оценки капитального строения в размере 666,08 белорусского рубля (шестьсот шестьдесят шесть рублей восемь копеек);<br>- возмещение победителем аукциона затрат, понесенных продавцом в Лидский филиал РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации» за составление выписок из ЕГР недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним о правах, ограничениях (обременениях) прав на объект недвижимого имущества в размере 30,28 белорусских рублей (тридцать рублей двадцать восемь копеек);<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта |
| **Начальная цена продажи** | 285 840 руб. (двести восемьдесят пять тысяч восемьсот сорок рублей) с учетом НДС по ставке 20 % |
| **Сумма задатка** | 28 584 руб. (двадцать восемь тысяч пятьсот восемьдесят четыре рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 22.07.2025 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/



ИЗВЕЩЕНИЕ
О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Центральная, д. б/н** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6 х 10 м.

Площадь: 63,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1948 года постройки.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Осипов Сергей Фёдорович, умер 09.03.1991 г., наследник – Свирид София Сергеевна.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32 , 801715 62 3 33.**

УНП 600092462



О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Мирославка, ул. Центральная, д. б/н**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Центральная, д. б/н (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Осипов Сергей Фёдорович, умер 09.03.1991 г., наследник – Свирид София Сергеевна.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням). Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462


# ЖЫВІ І КВІТНЕЙ, ЛЮБІМАЯ РАДЗІМА!

## Дзень Незалежнасці шырока адзначылі па ўсёй краіне

Урачыстасці з нагоды свята ладзіліся ў кожным куточку Беларусі. Суайчыннікі спявалі, радаваліся, але пры гэтым не забывалі ўшанаваць памяць і выказаць словы ўдзячнасці тым, хто вялікай цаной здабыў нам права жыць і святкаваць. Дзень Незалежнасці для нас — без перабольшвання свята жыцця. А яшчэ — свята адзінства, свята гонару за свой народ і за любімую Радзіму — за сябе саміх. Таму зусім не здзіўляешся, калі чытаеш заяву МУС, што па ўсёй краіне падчас масавых мерапрыемстваў не было ніводнага надзвычайнага здарэння. Людзі, якія паважаюць саміх сябе і сваю краіну, і святы адзначаюць годна. Весела і з размахам.

А яшчэ добрая навіна святочнага дня — 3 ліпеня на свет з'явіліся 158 новых беларусаў. І жыццё іх абавязкова будзе мірным, добрым і шчаслівым, калі яны будуць памятаць, што азначае дзень, у які яны з'явіліся на свет, для іх Радзімы.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і БелТА.**





























**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1.** Грузовой специальный цистерна ГАЗ 3309, год выпуска – 2008 г., регистрационный знак АВ 2501-1, кузов № X7247389280000970 / 33090080969914 | 4 920,00 | 246,00 |
| **Лот № 2.** Грузовой специальный фургон изотермический GAZ-3307, год выпуска – 2005 г., регистрационный знак АК 4191-1, кузов № Y3H47380050036462 / 33070050891961 | 6 240,00 | 312,00 |
| **Лот № 3.** Грузовой специальный фургон-рефрижератор GAZ-3307, год выпуска не определен, регистрационный знак АК 4174-1, кузов № Y3H47380030021800 / 33070030836214 | 7 800,00 | 390,00 |
| **Лот № 4.** Грузовой специальный фургон-рефрижератор GAZ-33 07, год выпуска – 2005 г., регистрационный знак АК 4145-1, кузов № Y3H47380060037343 / 33070050891687 | 6 240,00 | 312,00 |
| **Лот № 5.** Грузовой фургон изотермический GAZ-27901, год выпуска – 2009 г., регистрационный знак АВ 9641-1, кузов № 33070090168210 / 33090090981968 | 6 480,00 | 324,00 |
| **Лот № 6.** Грузовой фургон-рефрижератор ГАЗ 3302, год выпуска – 2007 г., регистрационный знак АА 5837-1, кузов № 33020072208287 | 10 080,00 | 504,00 |

**Местоположение объектов:** Брестская обл., г. Ляховичи, ул. Советская, 79. **Продавец:** СОАО «Ляховичский молочный завод», 225372, Брестская обл., г. Ляховичи, ул. Советская, 79, тел. 80163364159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % предоплата в течение 5 рабочих дней с даты заключения договора. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 07 августа 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 06 августа 2025 г. до 17.00**



ИЗВЕЩЕНИЕ
О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Луговая, д. 25** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 4 х 10 м.

Площадь: 36,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1958 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный жилой дом разрушен.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: собственник – Бондарь Иван Николаевич, умер 25.10.2004 г.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32 , 801715 62 3 33.**

УНП 600092462



О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Мирославка, ул. Луговая, д. 25**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Мирославка, ул. Луговая, д. 25 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Бондарь Иван Николаевич, умер 25.10.2004 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням). Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ**
**ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-96314 (наименование: Зерносклад; назначение: Здание специализированное сельскохозяйственного назначения) площадью 317,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 38А/5, зерносклад, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000091 площадью 0,1075 га | 21 100,00 | 2 110,00 |
| **Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-74045 (наименование: Зернохранилище; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 1111,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 66/ 2, на земельном участке с кадастровым номером 121281200001000021 площадью 0,3055 га | 100 600,00 | 10 060,00 |
| **Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71128 (наименование: Здание телятника; назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 321,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 60/5, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000118 площадью 0,1666 га, составные части и принадлежности: артскважина, сенажная траншея | 37 400,00 | 3 740,00 |
| **Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70546 (наименование: Здание для откорма скота; назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 2047,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027553 площадью 1,4951 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика, площадка для складирования навоза, водонапорная башня, артскважина, погрузочно-разгрузочная рампа стационарная с весами | 202 096,00 | 20 209,60 |
| **Лот № 5**<br>1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71675 (наименование: Телятник; назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 1830,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71, телятник, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058 площадью 1,8556 га, составные части и принадлежности: площадка для складирования подстилки и навоза, дворовое покрытие, забор, забор.<br>2) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70600 (наименование: Телятник; назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 1848,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/2, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058 площадью 1,8556 га, составные части и принадлежности: покрытие выгульного дворика, бетонное покрытие, забор.<br>3) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71261 (наименование: Склад соли; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 169,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/11, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058, площадью 1,8556 га.<br>4) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71421 (наименование: Склад ТМЦ; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 237,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/12, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058 площадью 1,8556 га | 612 840,00 | 61 284,00 |
| **Лот № 6.** Кормораздатчик КРБ-4,7, год выпуска 2013 г., заводской № 228, инвентарный № 37881 | 4 700,00 | 470,00 |

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», 225003, Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, тел. 80162918132. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 22 июля 2025 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 21 июля 2025 г. до 17.00**


СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ІМПУЛЬС ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ

## Паміж Беларуссю і Лівіяй падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў

Днямі ў Доме ўрада ў прысутнасці Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына і старшыні ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі доктара Асамы Хамада быў падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў, паведамілі ў Савеце Міністраў.

У прыватнасці, міністр прамысловасці Беларусі Андрэй Кузняцоў і міністр прамысловасці ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі Мухамад Ас-Саідзі падпісалі Пагадненне аб намерах паміж міністэрствамі.

Акрамя таго, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Юрый Горлаў і міністр сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі Юнус Аль-Урафі падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні па развіцці супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі паміж міністэрствамі, а таксама пратакол аб намерах паміж міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і Нацыянальным агенцтвам развіцця Лівіі.

Першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Бахановіч і міністр тэхнічнай адукацыі ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі Фарт Халіл падпісалі Мемарандум аб намерах па супрацоўніцтве паміж міністэрствам адукацыі Беларусі і міністэрствам вышэйшай адукацыі і навуковых даследаванняў урада нацыянальнай стабільнасці Лівіі.

Таксама першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Аляксандр Худалееў і міністр унутраных спраў урада нацыянальнай стабільнасці Лівіі Ісам Мухамед Хасан Абу Зарыба падпісалі пратакол аб намерах па стварэнні ў горадзе Бенгазі сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

Акрамя таго, міністр аховы здароўя Беларусі Аляксандр Хаджаеў і міністр аховы здароўя ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі Усман Абдэльджаліл падпісалі План мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва ў сферы аховы здароўя.

Па выніках мерапрыемства Аляксандр Турчын выказаў упэўненасць, што падпісаныя дакументы паслужаць імпульсам для далейшага супрацоўніцтва Беларусі і Лівіі.

АКТУАЛЬНА

# НАВАЦЫІ РАЗЛІКУ

## Урад і Нацыянальны банк перагледзелі патрабаванні да дзейнасці касавага абсталявання

Адпаведную пастанову падпісалі Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын і першы намеснік старшыні Праўлення Нацбанка Аляксандр Ягораў, паведамілі ў прэс-службе ўрада.



Тут растлумачылі, што пастанова дазволіць мінімізаваць складанасці ў гандлёвых аб'ектах, якія ўзніклі з 1 ліпеня 2025 года, звязаныя з неабходнасцю адначасовага сканавання пры продажы тавараў ідэнтыфікацыйных знакаў, што наносяцца на іх, у выглядзе лінейнага штрыхавога кода (GTIN) і QR-кода (наносіцца ў рамках дзейнай у краіне сістэмы маркіроўкі тавараў).

У залежнасці ад віду тавар можа быць прамаркіраваны нацыянальным QR-кодам або QR-кодам, што прымяняюцца ў адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі — пагадненнем аб маркіроўцы тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе ад 2 лютага 2018 года.

Пастанова дазволіць выключыць неабходнасць сканавання нацыянальнага QR-кода, якім у цяперашні час маркіруецца большасць тавараў, у тым ліку паўсядзённага попыту.

У дачыненні да тавараў, прамаркіраваных у адпаведнасці з пагадненнем (малочная прадукцыя, абутак, шыны і асобныя тавары лёгкай прамысловасці (верхняе адзенне, бялізна сталовая, пасцельная і кухонная), у большасці выпадкаў захаваецца абавязак па сканаванні толькі міжнароднага QR-кода, паколькі ён уключае ў сябе GTIN.

Як расказала намеснік начальніка ўпраўлення электронных сістэм кантролю галоўнага ўпраўлення кантролю рэалізацыі тавараў і паслуг МПЗ Вольга Тараканава, на сёння ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам большасць тавараў маркіруецца ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі.

**— У той жа час, з улікам рашэнняў, якія прымаюцца ў Еўразійскай эканамічнай камісіі, нацыянальная маркіроўка ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі будзе трансфармавана ў маркіроўку сродкамі ідэнтыфікацыі. Гэта звязана з тым, што сродкі ідэнтыфікацыі могуць закадзіраваць у сабе больш інфармацыі аб таварах, што падлягаюць маркіроўцы, — растлумачыла спецыяліст.**

Паводле яе слоў, у цяперашні час большасць касавага абсталявання дазваляе са сродкаў ідэнтыфікацыі здабываць штрых-код, або так званы GTIN. У гэтай сувязі, калі пакупнік на касе самаабслугоўвання набывае тавар, які падлягае маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі, то яму дастаткова счытаць толькі код маркіроўкі. Калі пакупнік прабівае свой тавар не на касе самаабслугоўвання, а на звычайнай касе, то ў дадзеным выпадку прадавец на тавары, якія падлягае маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі, таксама можа счытаць толькі код маркіроўкі, што змяшчаецца ў сродку ідэнтыфікацыі.

Спецыяліст нагадала: на дадзены момант у Рэспубліцы Беларусь маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі падлягаюць такія тавары, як малако, малочная прадукцыя, абутак.

**— Па таварах паўсядзённага попыту, якія падлягаюць маркіроўцы ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі, такіх як кава, чай, напоі, цяпер ужо пры рэалізацыі на касах уніфікаваны кантрольны знак счытваць не трэба — ні касіру, ні пакупніку, калі ён будзе набываць тавар на касе самаабслугоўвання, — дадала Вольга Тараканава.**

Паводле яе слоў, у цяперашні час большасць касавага абсталявання, якое выкарыстоўваецца ў краіне, дапрацавана да новых патрабаванняў і дазваляе са сродкаў ідэнтыфікацыі здабываць усю неабходную інфармацыю і перадаваць яе ў сістэму кантролю касавага абсталявання.

## Панядзелак, 7 ліпеня

### Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
8.15, 18.45 Зона Х (16+).
8.50 Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Раства Іаана Прадцечы.
9.15 Галоўны эфір.
